чуць яе асобныя галасы, лініі -- адзін з галоўных элементаў прафесійнага майстэрства дырыжора.

Аркестр выхоўвае пачуццё слыхавога кантролю ў працэсе аркестравага выканання. Гэта паслядоўна ажыццяўляецца на працягу ўсяго перыяду навучання. Слыхавы кантроль -- галоўная якасць дырыжорскай дзейнасці. Яго ролю ў развіцці будучага дырыжора добра раскрыў А.В.Гаук: «Гэта пачуцце пастаяннага кантролю ў далейшым адыграла вялікую ролю ў маёй дырыжорскай рабоце, паколькі без гэтага ніякае паспяховае выкананне немагчыма".

Аркестр з'яўляецца адным з самых галоўных рэгулятораў фарміравання ўнутрыкалектыўных адносін. Ён падтрымлівае духоўную блізкасць паміж усімі ўдзельнікамі калектыву,выхоўвае ў студэнтаў здольнасць да ўзаемаразумення.

Аркестравы клас вучыць студэнтаў успрымаць рукі дырыжора.Фарміруе ў іх здольнасць разумець задуму, якая перадаецца праз жэст. У аркестры студэнты пачынаюць успрымаць прафесію дырыжора глыбей. Яны разумеюць, што не вельмі добра, калі дырыжор многа размаўляе, што ён павінен карыстацца такімі сродкамі, як міміка,жэст,позірк. Тут яны ўсведамляюць, якое вялікае значэнне мае для дырыжора веданне інструментаў аркестра,іх магчымасцей,штрыхоў,прыёмаў ігры.

Немагчыма стварыць ансамбль, абмяжоўваючыся толькі ўвагай да жэста дырыжора. На аркестравых рэпетыцыях у працэсе работы над творам, у працэсе стварэння яго мастацкага вобраза ставіцца некалькі розных задач. Выконваючы сваю партыю, студэнт павінен прачытаць нотны тэкст, ажывіць яго правільнай фразіроўкай, штрыхамі, дынамікай, вызначыць аплікатуру. Студэнт у аркестры павінен слухаць сябе, асобную групу, аркестр у цэлым павінен умець рэагаваць на змяненне тэмпу,дынамікі.Каб паспяхова рэалізаваць музычна-выканальніцкія планы кіраўніка,ад студэнтаў патрабуецца вялікая ўвага.

Такім чынам, становіцца відавочнай роля аркестравага класа ў музычным развіцці студэнтаў — будучых кіраўнікоў аркестравых калектываў. Аркестр састаўляе галоўнае звяно ў сістэме навучання і выхавання студэнтаў. Аркестр — гэта творчая майстэрня, дзе выхоўваюцца будучыя кіраўнікі і дырыжоры аркестравых калектываў.

**Малахава І.А.,**
выкладчык

## АЛГАРЫТМ РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ АСОБЫ СРОДКАМІ МАСТАЦТВА

Праблема развіцця творчых якасцей асобы набывае актуальнасць і значнасць у перыяды сацыяльнай пераарыентацыі грамадства, паколькі ўзнікае вострая неабходнасць захоўваць і развіваць назапашаныя каштоўнасці як у матэрыяльнай, так і ў духоўнай сферах жыцця. Прагрэс жа чалавецтва залежыць ад канцэнтрацыі таленавітых людзей у кожным пакаленні. Таму, чым вышэй у пакаленні працэнт творчых асоб, тым лепш і багацей такое грамадства. Гэта, верагодна, галоўны параметр, які вызначае магчымасці грамадства, яго перспектывы і будучыню ў цэлым, таму што калі чалавек заняты работай, яму не тое што не да агрэсіі, яму не будзе калі займацца сваркамі ў калідоры. Такім чынам, ва ўмовах бурных змен навакольнай рэчаіснасці нязменнай ва ўсёй гісторыі чалавецтва застаецца вось гэта здольнасць да ачышчэння, прасветленасці ў творчасці. Значыць, нягледзячы на існаванне некалькіх выключэнняў у сэнсе адмоўнай творчасці, прагрэс усё роўна застаецца, і грунтуецца ён на творчасці.

Сучасная трактоўка праблемы творчасці, эксперыментальна пацверджаная даследчыкамі розных краін (В.Андэрсонам, Дж.Гілфардам, А.Н.Лукам, І.М.Разетам, Я.А.Панамаровым і інш.), адрозніваецца прызнаннем таго факта, што праяўленне творчых якасцей носіць універсальны характар, г.зн. крэатыўнасць разглядаецца як агульная універсальная здольнасць да



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчасці, неабходная для любой сферы дзейнасці асобы. Прычым развіццё крэатыўнасці ў якім-небудзь адным відзе дзейнасці цягне за сабой перанос творчых якасцей асобы на любую іншую сферу (сацыяльную, вытворчую, камунікатыўную, бытавую і інш.). Так, у працэсе мастацкай дзейнасці дзяцей і падлеткаў асабліва эфектыўна развіваюцца творчыя здольнасці, якія затым паспяхова выкарыстоўваюцца ў вучобе, зносінах, побыце, працы і інш. Гэта пацвярджае неабходнасць мастацкага выхавання ўсіх дзяцей і ўказвае на шырокія магчымасці мастацтва як сродку развіцця крэатыўнасці асобы.

Значыць, паспяховасць развіцця творчых якасцей асобы залежыць ад наступных фактараў: а) узроставага (дзяцінства, малалетцва, юнацтва і інш.); б) сродкаў развіцця (розныя віды мастацтва, матэматыка, тэхніка і г.д.); в) метадаў развіцця і методыкі (пэўныя дзеянні, накіраваныя на дасягненне мэты). Прычым на вызначаных узроставых этапах уздзеянне розных сродкаў развіцця творчых якасцей неаднолькава эфектыўна па прычыне сенсітыўнасці ўзросту. Так, можна гаварыць аб сенсітыўнасці падлеткавага ўзросту да развіцця крэатыўнасці сродкамі мастацтва музычнага тэатра.

Пры гэтым выкарыстанне канкрэтнага сродку развіцця вядзе да дасягнення пастаўленай мэты толькі ў строга азначаным кантэксце, г.зн. калі будуць улічаны ўмовы, матывы, вызначана паслядоўнасць дзеянняў, апісаны этапы работы і педагагічны інструментарый. Значыць, гаворка ідзе аб стварэнні нейкай пэўнай сістэмы развіцця ці методыкі, што ў сучаснай інтэрпрэтацыі атрымала назву алгарытм развіцця творчых якасцей асобы (па гэтай тэме глядзі працы Г.Альтшулера, І.Верткіна). Тэрмін матэматычнай логікі «алгарытм» абазначае дакладнае прадпісанне аб выкананні ў азначанай паслядоўнасці дзеянняў і аперацый, якія прыводзяць да рашэння тых ці іншых задач. Гэты тэрмін на першы погляд вельмі слаба супастаўны з тэрмінамі «творчасць», «творчыя здольнасці», «развіццё», але гэта толькі на першы погляд. Так, вывучаючы працэс развіцця творчых якасцей асобы ў сферы мастацкай дзейнасці, мы прыйшлі да вываду аб неабходнасці строга рэгламентаваць усю работу па падрыхтоўцы і стварэнню музычнага спектакля, паколькі імправізацыя, інсайт, інтуіцыя могуць праяўляцца толькі ў выніку вялікай падрыхтоўчай работы, якая і складае змест тэрміна «алгарытм» у дадзеным кантэксце. Значыць, неабходна рэгламентаваць не сам працэс творчай дзейнасці ў тым ці іншым відзе мастацтва, а ўсю падрыхтоўчую работу, якая папярэднічае стварэнню твора мастацтва, асабліва твора калектыўнага характару (напрыклад музычнага спектакля).

Такім чынам, выкарыстанне алгарытму развіцця творчых якасцей асобы сродкамі мастацтва не толькі не супярэчыць логіцы, але і актывізуе крэатыўнасць, садзейнічае праяўленню і развіццю творчых здольнасцей асобы ў працэсе мастацкай дзейнасці, а таксама дазваляе падняць узровень прыкладных даследаванняў творчасці на больш высокую ступень.

**Лысянкова В.В.,**
дацэнт

## РАЗВІЦЦЁ ПСІХАФІЗІЧНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ НА ЎРОКАХ КЛАСІЧНАГА ТАНЦА

Вялікі рускі фізіёлаг І.М.Сечанаў залажыў асновы навукі, якая атрымала назву «фізіялогія працы». Ён высветліў, што пры выкананні фізічнай працы вельмі важна падабраць сярэдні тэмп і нагрузку так, каб прадукцыйнасць працы была высокай, а стомленасць наступала як мага пазней. Вучоныя прыйшлі да вывадаў: 1. Чым хутчэй рытм скарачэння мышц, тым хутчэй у іх развіваецца стомленасць. 2. Чым больш нагрузка, тым хутчэй у мышцах развіваецца стомленасць.

Рытм скарачэння мышцаў пры занятках на ўроках класічнага танца залежыць ад зададзеных практыкаванняў, якія ў сваю чаргу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ